Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

2 ЛІСТАПАДА 2007 г. ПЯТНІЦА
№ 210 (26075)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## БЮДЖЭТНІКІ — З ПРЫБАЎКАЙ

**Урад прыняў рашэнне аб павелічэнні з 1 лістапада тарыфнай стаўкі I разраду для бюджэтных арганізацый і арганізацый, якія карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі. У прыватнасці, як паведаміў намеснік міністра эканомікі Андрэй Тур, найменшая «бюджэтная» тарыфная стаўка ўзрасце амаль на 7,7 працэнта — з 65 тыс. да 70 тыс. рублёў.**

Як адзначыў Андрэй Тур, павелічэнне «бюджэтнай» тарыфнай стаўкі I разраду дазволіць выканаць прагнозныя пакажчыкі па росце зарплаты на гэты год. Дарэчы, варта зазначыць, што паводле звестак статыстыкі, сярэдняя зарплата па краіне ў верасні складала 713,4 тыс. рублёў (або 331,8 долара ў эквіваленце), пры гэтым у параўнанні з вераснем мінулага года адбылося яе павелічэнне на 17,8 працэнта. Адначасова сёлетняя сярэдняя верасnёўская заробак бюджэтнікаў склала 603,4 тыс. рублёў (280,7 долара) і павялічыліся адносна аналагічнага перыяду летась на 13,9 працэнта.

**Сяргей ГРЫБ.**

## Аляксандр Лукашэнка адводзіць важную ролю навуцы ў развіцці эканомікі Беларусі

Навука павінна стаць генератарам, што выведзе народную гаспадарку на новы, высокаэфектыўны тэхналагічны ўзровень, які можа забяспечыць Беларусі дастойную сучаснасць і будучае. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, уручаючы дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам розных сфер дзейнасці.

За значныя дасягненні ў сферы адукацыі, навукі, няспынную плённую навукова-педагагічную дзейнасць ордэнам Пашаны ўзнагароджаны рэктар Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Уладзімір Шымаў. Рэктар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Барыс Хрусталёў адзначаны ордэнам Францыска Скарыны, прафесару кафедры металургічных тэхналогій гэтай ВНУ Ірыне Трусавай прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь».

Прэзідэнт уручыў медаль «За адвагу» студэнту механіка-матэматычнага факультэта БДУ Сяргею Яфіменку, які двойчы выратаваў людзей, якія танулі.

Ордэна Пашаны ўдастоены электразваршчыкі ААТ «Будаўнічы трэст № 8» Георгій Баравік і Васіль Будзько, брыгадзір трубаўкладчыкаў Васіль Вайтовіч. Ганаровае званне «Заслужаны будаўнік Рэспублікі Беларусь» прысвоена брыгадзіру тынкоўшчыкаў філіяла «Спецыялізаванае ўпраўленне № 33» Ніне Дзямідовіч. Сярод узнагароджаных медалём «За працоўныя заслугі» — генеральны дырэктар ААТ «Будаўнічы трэст № 8» Міхаіл Водчыц і іншыя.

Ордэнам Айчыны II ступені ўзнагароджаны старшыня Магілёўскага аблвыканкама Барыс Батура, ордэнам Пашаны — дырэктар ВПУП «Універсал Бабруйск» Уладзімір Аўчыннік. Ганаровага звання «Заслужаны работнік прамысловасці Рэспублікі Беларусь» удастоены начальнік цэха ВРУП «Мінскі электратэхнічны завод імя В.І. Казлова» Эдуард Ладуцька. Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена старшыні Гомельскага гарадскога выканаўчага камітэта Аляксандру Бяляеву, дырэктару ААТ «Стрыгава» Уладзіміру Кузічу, дырэктару ААТ «Мінская птушкафабрыка імя Н.К. Крупскай» Пятру Ярмашу.

Словы ўдзячнасці кіраўнік дзяржавы адрасаваў тым, хто прысвяціў сваё жыццё захаванню, ахове і прымнажэнню духоўных багаццяў беларускага народа. Ордэнам Францыска Скарыны ўзнагароджаны дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Уладзімір Адамушка і галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка» Уладзімір Ліпскі. Медалём Францыска Скарыны адзначаны намеснік дырэктара па ідэалогіі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М.Горкага Валянціна Сцяпанава і артыстка вышэйшай катэгорыі гэтага тэатра Бэла Масумян, а таксама вядучы майстар сцэны Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Ігар Сігаў. Ганаровае званне заслужанага дзеяча культуры Беларусі прысвоена загадчыку аддзела галоўнай дырэкцыі спартыўнага вяшчання Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Уладзіміру Навіцкаму. Аляксандр Лукашэнка таксама ўручыў спецыяльныя лісты аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь галоўнаму рэдактару газеты «Рэспубліка» Анатолю Лемяшонку, намесніку дырэктара Нацыянальнага архіва Беларусі Людміле Мурмыла, архівісту Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці Святлане Лук'янавай.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## Сёння адкрываецца I з'езд вучоных Беларусі

Учора прайшлі секцыйныя пасяджэнні. Рэктар Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Барыс Хрусталёў, выступаючы на секцыйным пасяджэнні па фізіка-матэматычных навуках, адзначыў, што толькі апора на інавацыйную прамысловасць дазволіць павысіць канкурэнтаздольнасць беларускай прадукцыі, умацаваць пазіцыі Беларусі на знешніх рынках. «Спецыялісты сёння абавязкова павінны валодаць майстэрствам творчага вырашэння практычных пытанняў, уменнем выкарыстоўваць у сваёй рабоце ўсё новае, што з'яўляецца ў навуцы і практыцы, пастаянна ўдасканальваць кваліфікацыю», адзначыў рэктар БНТУ. Паводле яго слоў, у гэтай сувязі сучасная сістэма адукацыі Беларусі павінна быць наладжана так, каб максімальна развіваць здольнасці маладых спецыялістаў арыентавацца ў агромністым патоку інфармацыі, самастойна папаўняць свае веды і практычнае майстэрства.

На пасяджэнні секцыі адзначалася, што самым лепшым рашэннем у гэтым напрамку з'яўляецца стварэнне філіялаў кафедраў беларускіх універсітэтаў і іншых ВНУ на буйных вытворчых прадпрыемствах. Гэта не толькі дазволіць лепш наладзіць практыку маладых спецыялістаў, але і праводзіць адбор найбольш актыўных студэнтаў для іх далейшай працы на вытворчасці.

**Кар. «Звязды».**

Добрыя весткі

## БЛІЗНЯТКІ — У КОЖНУЮ ХАТКУ!



*Лілія ДЗЕМЧАНКА з дачушкамі-двайняткамі Настассяй і Аленкай.*

«Дзяцей зараз мець модна!» — жартуюць медыкі і адзначаюць, што з кожным годам нараджальнасць па краіне перавышае смяротнасць: сёлета ў студзені—верасні на свет з'явілася больш за 77 тысяч дзяцей — гэта на 8,4 працэнта больш у параўнанні з леташнім Днямі адбылося ўрачыстае адкрыццё адрамантаванага 4-га аддзялення радзільнага дома Барысаўскай цэнтральнай раённай бальніцы.



— Заканчэнне рамонту для нас — вялікае свята, — падзялілася загадчыца радзільнага дома Галіна Хацько. — Цяпер нашы даражэнькія матулечкі змогуць атрымліваць медыцынскую дапамогу ў самых лепшых умовах. Раддом абслугоўвае больш за 100 тысяч жанчын Барысаўшчыны і амаль столькі ж з Бярэзінскага, Крупскага, Жодзінскага і Смалявіцкага раёнаў! Сёння ў нас каля 300 чалавек медыцынскага персаналу. Так што да дзіцячага буму мы ўжо поўнасцю падрыхтаваныя!

Павітаць маладых мам і ўвесь медыцынскі персанал прыехаў старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Леанід Крупец.

— Кожны год на Міншчыне ўводзяцца новыя сацыяльныя аб'екты, у тым ліку і медыцынскія. Нядаўна ў Салігорскім раёне адкрыта Старобінская бальніца, праводзяцца капітальныя рамонты, закупляецца вельмі добрае абсталяванне. Кожны год у вобласці на ахову здароўя выдзяляецца 20—22 працэнта бюджэтных сродкаў. Сёлета гэта сума складае больш за 400 мільярдаў рублёў. Хачу сказаць вялікі дзякуй усім барысаўчанам, бо менавіта яны, працуючы на суботніках, дапамаглі грашыма гэтай добрай справе!

Летась першы ўздых менавіта ў Барысаўскім радзільным доме зрабілі 2022 малыя. У гэтым — амаль 2500. У дзень нараджаецца каля сямі дзяцей, прычым хлопчыкаў крыху больш, чым дзяўчынак. У апошні час павялічылася і колькасць блізнятаў.

Маладая маці Алена Лушчанка ў Барысаўскім раддоме чакае ўжо сваё трэцяе дзіця.

— Дзяўчынка! — радасна паведамляе яна. — У мяне ўжо два хлопчыкі — Арцёмка і Ванюша, абодвух нарадзіла тут. Медыцынскі персанал заўсёды быў добры, уважлівы. А вось з рамонтам яшчэ і больш камфортна стала. Мне, паверце, параўноўваць ёсць з чым!

Маленькай Валерыі Маліновіч ужо шэсць дзён. Дома яе разам з маці Веранікай чакаюць тата і пяцігадовы брацік Данілка.

— Была магчымасць паехаць нараджаць у Мінск, — расказвае Вераніка. — Але вырашыла тут. І дзякуй Богу!

Лілія Дземчанка ажно свеціцца ад шчасця. Хутка маладую маці забяруць дадому з дзвюма дзяўчынкамі-двайняткамі — Настассяй і Аленкай.

— Шкада адпускаць такіх прыгажунь! — шэпчацца ўвесь персанал.

Радзільны дом даўно працуе па сістэме партнёрскіх родаў, ужо з 1998 года маці і дзіця тут могуць знаходзіцца ў асобнай палаце. Вялікую ўвагу ўрачы надаюць груднному выкормліванню.

— Мы ўсе імкнёмся да таго, каб нашы дзеткі былі здаровымі, — падсумоўвае Галіна Хацько.

**Марына БЕГУНКОВА.**
**Фота аўтара.**



## ДЗЯДЫ — НАШЫ АБАРОНЦЫ

*Жыхарка г. п. Ракаў Валожынскага раёна Лілія БАГДАНОВІЧ кожныя Дзяды наведвае магілы родных.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

## ДЛЯ ПАМЕРЛЫХ ГАЛОЎНАЕ — НАША МАЛІТВА

У гэтую суботу і праваслаўныя, і католікі асаблівым чынам памінаюць памерлых. У Касцёле працягваецца актава Успаміну, гэта значыць 8 дзён спецыяльных памінальных малітваў, якая пачалася 1 лістапада. А ў праваслаўных 3 лістапада — Дзмітраўская бацькоўская субота, якая адбываецца ў бліжэйшую суботу перад днём памяці святога велікамучаніка Дзмітрыя Салунскага (8 лістапада).

Дзмітраўская субота была ўстаноўлена Дзімітрыем Данскім пасля бітвы на Куліковым полі 8 верасня 1380 года па блаславенні прападобнага Сергія Раданежскага. Спачатку памінанне адбывалася толькі за тых, хто загінуў у гэтай бітве. З цягам часу Дзмітраўская субота стала днём памінання ўсіх памерлых праваслаўных хрысціян.

І праваслаўныя, і каталіцкія святары нагадваюць вернікам, што прыносіць ежу і спіртныя напоі на могілкі недапушчальна, што гэта паганскі звычай, несумяшчальны з хрысціянскім вучэннем аб жыцці і смерці. Тым, хто пайшоў ад нас, патрэбны толькі нашы малітвы і нашы добрыя справы ў іх памяць. Таму вернікі ў гэтыя дні прыбіраюць магілкі і ідуць у храмы, дзе падаюць памінальныя запіскі, спавядаюцца і прычашчаюцца.

Святыя айцы вучаць, што ў блізкіх сваякоў памерлага, асабліва ў дзяцей і ўнукаў, гэта значыць у прамых патомкаў, ёсць вялікая магчымасць дапамагчы памерлым продкам — даць плады духоўнага жыцця. Для гэтага трэба жыць у малітоўным вопыце Царквы, удзельнічаць у святых Тайнах і жыць па запаведзях Хрыста. Хоць тыя, хто адышоў ад нас, самі і не вырасцілі гэтыя плады, — іх прад'явілі іх дзеці альбо ўнукі, але і яны, памерлыя продкі, маюць да іх дачыненне, як карані альбо ствол.

Пра час набажэнстваў на могілках і асвячэння магіл можна даведацца ў прыходскіх касцёлах і цэрквах.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі дасягнулі 3 млрд 51 млн USD

**Аб гэтым журналістам учора паведаміў старшыня Праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Пётр Пракаповіч. Атрымліваецца, што з пачатку года рэзервовыя актывы нашай краіны павялічыліся на 1,3 млрд долараў. На стварэнне першага мільярда долараў рэзервовых актываў было патрачана 7 гадоў, а трэці мільярд актываў краіна «зарабляла» ўсяго 3 месяцы.**

За апошні час насельніцтва стала больш давяраць нацыянальнай валюце. Сёлета істотна паменшылася адмоўнае сальда куплі валюты насельніцтвам, якое за 9 месяцаў года склала 333 мільёны долараў. За адпаведны мінулагодні перыяд гэты паказчык складаў аж 482 мільёны долараў.

У лістападзе змяненне стаўкі рэфінансавання не запланавана; ці будзе яно ў снежні — сёння гэта пытанне застаецца адкрытым.

Курс беларускага рубля застаецца стабільным на працягу ўжо 4 гадоў, і, на думку кіраўніка Нацбанка, ён будзе заставацца стабільным і ў наступным годзе. Пётр Пракаповіч запэўніў, што паўтарэння мінулагодняй сітуацыі, калі насельніцтва пэўны час актыўна набывала замежную валюту за беларускія рублі, сёлета не будзе. Тады валютны ажыятаж быў выкліканы складанай сітуацыяй, якая склалася вакол змянення цэнаў на энерганосьбіты з Расіі. Насельніцтва тады не атрымлівала поўнай і дасканалай інфармацыі на гэты конт. Сёння і на бліжэйшыя чатыры гады паміж нашай краінай і Расіяй існуе поўная яснасць па цэнах на энерганосьбіты і няма нават надуманых падстаў для выклікання нестабільнасці на валютна-грашовым полі краіны, запэўніў кіраўнік Нацбанка.

Сёння японская іена выкарыстоўваецца ў якасці рэзервовай валюты ў невялікіх аб'ёмах. Гэтыя аб'ёмы могуць істотна павялічыцца пасля атрымання нашай краінай буйнога крэдыту з японскай прапіскай, магчыма, яшчэ да канца гэтага года.

Пётр Пракаповіч падкрэсліў, што стабільнасць фінансавых інстытутаў краіны ўзмацняецца, бо, напрыклад, прыбытак банкаўскай сферы за 9 месяцаў года дасягнуў 415,7 млрд рублёў. З іншага боку, доля праблемных крэдытаў штогод памяншаецца і на пачатак кастрычніка склала ўсяго 0,81 працэнта ад аб'ёму ўсіх выдадзеных крэдытаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ЦЭНТРалізаванае кіраванне маёмасцю



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**На гэтым тыдні споўнілася пяць гадоў з моманту заснавання КУП «Мінскі гарадскі цэнтр нерухомасці». З нагоды юбілею карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з дырэктарам Мінскага гарадскога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці Андрэем ТАКАРЧУКОМ (фонд з'яўляецца заснавальнікам Цэнтра). Падчас гутаркі закранаалася як тэма працы Цэнтра, так і іншыя пытанні, звязаныя з рынкам нерухомасці і прыватызацыяй.**

### Пра прыватызацыю

— Працэс прыватызацыі вельмі шырока закрануў камунальную ўласнасць усёй краіны, не толькі Мінска. А ў сталіцы сёння прыватызавана больш за 80 працэнтаў камунальнай уласнасці.

Пры гэтым сёння змяніліся акцэнты: калі на пачатку 1990-х гадоў галоўным было ажыццявіць прыватызацыю, то сёння галоўнае — эфектыўнае кіраванне дзяржаўнай маёмасцю, якая маецца.

І сёння маіх калег больш непакоіць, як увесці ў гаспадарчае абарачэнне тую дзяржаўную маёмасць, якая стала «кінутай». Гэта значыць аб'екты стаяць без вакон, дзвярэй і г. д. Асабліва шмат іх на вёсцы, але і ў Мінску хапае. На пачатак года налічвалася 75 такіх аб'ектаў. Быў распрацаваны графік уводу іх у эксплуатацыю, задзейнічання. У прынцыпе, гэты графік мы выконваем.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

*Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 552*

## АБ ПАВЫШЭННІ ПРАЦОЎНЫХ ПЕНСІЙ

У мэтах павышэння працоўных пенсій **пастанаўляю:**

1. Правесці з 1 лістапада 2007 г. карэкціроўку фактычнага заробку пенсіянераў і перарасчёт працоўных пенсій зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы за III квартал 2007 г.

2. Расходы па перарасчёту працоўных пенсій фінансаваць за кошт сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

3. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.**

*31 кастрычніка 2007 г., г. Мінск.*

## СЯРЭДНЯЯ ПРАЦОЎНАЯ ПЕНСІЯ СКЛАДЗЕ 160 ДОЛАРАЎ

**З 1 лістапада сярэдняя працоўная пенсія ў Беларусі складае 345,3 тыс. рублёў, або больш за 160 долараў у эквіваленце. Аб гэтым паведаміла начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна КАРАЛЁВА.**

Як зазначыла Валянціна Каралёва, перарасчёт працоўных пенсій адбудзецца на падставе ўказа кіраўніка дзяржавы, зыходзячы з сярэдняй зарплаты за III квартал, якая склала 727 173 рублі. Прычым гэта будзе ўжо другі перарасчёт гэтага віду пенсій сёлета — варта нагадаць, што першы, таксама на падставе ўказа Прэзідэнта, праведзены ў верасні. У выніку цяперашняга перарасчёту працоўная пенсія ўзрасце ў сярэднім на 9,3 працэнта і складзе 345,3 тыс. рублёў. Разам з тым, адзначыла Валянціна Каралёва, у кожнага канкрэтнага пенсіянера «прыбаўка» будзе свая — у залежнасці ад індывідуальнага стажу і каэфіцыента заробку. Так, з 1 лістапада мінімальная пенсія па ўзросце пры стажы 25 гадоў у мужчын ці 20 гадоў у жанчын павысіцца на 6,6 працэнта і выйдзе на адзнаку 155,5 тыс. рублёў, максімальны памер пенсіі па ўзросце пры стажы адпаведна 45 і 40 гадоў і каэфіцыенце 4,0 і вышэй для непрацуючых пенсіянераў складзе 537,2 тыс., а максімальная пенсія для працуючых пенсіянераў (пры такім жа стажы і каэфіцыенце да 1,3) будзе адпавядаць 390 тыс. рублям. Апроч таго, з 1 лістапада ў сувязі са змяненнем бюджэту пражытачнага мінімуму робіцца індэксацыя мінімальных, сацыяльных пенсій, а таксама надбавак і павышэнняў. Праўда, паколькі рост БПМ аказаўся нязначным, нязначна павысяцца і гэтыя віды пенсій — на 0,2 працэнта.

**Сяргей ГРЫБ.**

## КАЛЕКТЫВУ ААТ «ААБ «БЕЛАРУСБАНК» АБ'ЯЎЛЕНА ПАДЗЯКА ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ

Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена калектыву работнікаў ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк» за дасягнутыя поспехі ў развіцці банкаўскай сістэмы і эканомікі краіны, надзейнае збераджэнне сродкаў насельніцтва.

Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, адпаведнае распараджэнне Аляксандр Лукашэнка падпісаў 1 лістапада.

## «РАСІЯ ІМКНЕЦЦА ЗМЕНШЫЦЬ ЗАЛЕЖНАСЦЬ АД КРАІН-ТРАНЗІЦЁРАЎ»

**Сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Расіі можа адбыцца да канца года. Аб гэтым заявіў учора Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў нашай краіне Аляксандр Сурыкаў падчас прэс-канферэнцыі ў Мінску. Ён дадаў, што ў выпадку, калі лідары краін сустрэнуцца сёлета, то гэта, верагодна, будзе не раней за парламенцкія выбары ў Расіі, запланаваныя на пачатак снежня.**

Пасол адзначыў таксама, што не выключае сустрэчы прэзідэнтаў у рамках правядзення Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы. Неабходнасць у яго правядзенні існуе, бо «ёсць рашэнні саюзнага ўрада, якія трэба зацвярджаць».

Аляксандр Сурыкаў заявіў, што сёння эканамічная інтэграцыя краін з'яўляецца «неверагодна высокай». Аб'ём тавараабароту сёлета паміж Беларуссю і Расіяй, на думку пасла, перавысіць 24 млрд долараў ЗША. У той жа час палітычныя адносіны краін, паводле слоў пасла, «трэба афармляць канстытуцыйным дакументам», з дапамогай якога можна стварыць наднацыянальныя органы кіравання. «Ці здолеем мы ўтрымаць суверэнітэт і незалежнасць дзяржаў (у поўным сэнсе слова) кожнай краіны ў гэтым дакуменце? Думаю, не. Частку функцый... трэба перадаваць наднацыянальнай структуры. Інакш няма сэнсу гэтым займацца». Гаворачы пра нядаўні выхад Расіі з Пагаднення краін СНД аб правядзенні ўзгодненай палітыкі ў галіне транзіту нафты, Аляксандр Сурыкаў адзначыў, што прычына такога кроку — імкненне «бізнэсу і дзяржавы зменшыць залежнасць ад эканамічных і палітычных рашэнняў краін-транзіцёраў».

Пасол заявіў, што выхад Расіі з Пагаднення не адаб'ецца негатыўна на Беларусі. Як і раней, Расія «будзе працаваць з Беларуссю на аснове двухбаковых дамоўленасцяў». Краіны «будуць пераходзіць да агульнапрынятых цэнаў» у галіне тарыфаў на транзіт. Аляксандр Сурыкаў таксама заявіў, што не бачыць неабходнасці ў будаўніцтве Расіяй другой ніткі газаправода «Ямал-Еўропа» ў сітуацыі, калі пачата будаўніцтва Паўночна-Еўрапейкага газаправода. Да таго ж, як адзначыў пасол, сёння ў значнай ступені не выкарыстоўваюцца магчымасці па перакачцы газу сістэмы «Белтрансгаза». «У нас прастойваюць магутнасці на 15 млрд кубічных метраў».

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

Падпіска-2008

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВАЕ ПАЎГОДДЗЕ

**ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА НА I КВАРТАЛ І I ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» (у рублях)**

| *Індэкс* | *на 1 месяц* | *на 3 месяцы* | *на 6 месяцаў* |
|---|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | 8800 | 26400 | 52800 |
| **63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)** | 8300 | 24900 | 49800 |
| **63858 (ведамасны)** | 14000 | 42000 | 84000 |
| **63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)** | 12800 | 38400 | 76800 |

**ПАДПІСКА НА I КВАРТАЛ І I ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА. ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА» «Да запатрабавання» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)**

| *Індэкс* | *на 1 месяц* | *на 3 месяцы* | *на 6 месяцаў* |
|---|---|---|---|
| **63850 (індывідуальны)** | 7460 | 22380 | 44760 |
| **63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)** | 6990 | 20970 | 41940 |
| **63858 (ведамасны)** | 9938 | 29814 | 59628 |
| **63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)** | 9431 | 28293 | 56586 |

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

Открытое акционерное общество
«Сберегательный банк «Беларусбанк»,
расположенное по адресу:
220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,
сообщает о проведении 8 ноября 2007 года
внеочередного Общего собрания акционеров
в заочной форме со следующей повесткой дня:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 6 ноября), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 8 ноября) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704 (в), а также в филиалах – областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

**Дата окончания приема бюллетеней – 5 ноября 2007 г.**

**Телефоны для справок: (8-017) 218 84 38, 218 84 04.**

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.11.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 151,00 |
| 1 еўра | 3 103,46 |
| 1 латвійскі лат | 4 417,74 |
| 1 літоўскі літ | 898,89 |
| 1 чэшская крона | 115,11 |
| 1 польскі злоты | 854,33 |
| 1 расійскі рубель | 87,14 |
| 1 украінская грыўня | 425,41 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 24,6847 |
| 10 UAH | 48,7686 |
| 1000 BYR | 11,4586 |
| EUR | 35,6768 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 1.11.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

ISSN 1990 - 763X

07210>

9771990763008

